Чаму нараджаюцца дзеці?

Аўтар: Рэдакцыя
20.11.2016 00:00



Большасць людзей у дарослым узросце ствараюць сем’і. Знаходзяць блізкага чалавека, жывуць з ім у любові і ўзаемаразуменні, разам нараджаюць і выхоўваюць дзяцей, цешацца іх поспехам, перадаюць свае веды і вопыт...

На працягу многіх тысяч гадоў людзі нараджаюцца, затым сталеюць, старэюць і паміраюць. Дзякуючы з’яўленню на свет дзяцей пакаленне людзей аднаўляецца. За нашчадкамі – будучыня чалавецтва! Калі б дзеці на нараджаліся, чалавечы род спыніўся б.

Сярод шматлікіх народаў і народнасцей, якія жывуць на планеце, ёсць настолькі малалікія, што ім у бліжэйшы час пагражае знікненне (асабліва калі з пакалення ў пакаленне нараджаецца ўсё менш і менш дзяцей). Таму вельмі важна, каб былі нашчадкі. Дзеці не толькі прыносяць радасць сваім бацькам, бабулям і дзядулям, але і даюць упэўненасць у будучыні народа і чалавецтва ў цэлым. †



Чакаем Тваіх “чаму”, якія можаш дасылаць на адрас рэдакцыі.

На пытанні заўсёды гатовыя адказаць с. Вераніка Блізнюк FMA, салезіянскія аніматары Ганна Семак і Вераніка Рогач са Смаргоні.

Заданне:

Намаляваць або зрабіць фотаздымак сваёй сям’і і напісаць на ім Дзен

Пры падрыхтоўцы рубрыкі выкарыстаны ўрыўкі з кнігі Ігара і Андрэя Баранавых “Тата, адкажы мне, чаму...”